*9.* National Digital Library of India [Electronic Resource] // NDLI. – Mode of access: https://ndl.iitkgp.ac.in/. – Date of access: 12.09.2022.

*10.* Policy Paper. UK Digital Strategy 2017 [Electronic Resource] // gov.uk. – Mode of access: https://www.gov.uk/government/publications/uk-digital-strategy/uk-digital-strategy. – Date of access: 12.09.2022.

УДК [398.33:7.011](476.2)

**В. В. Калацэй,**
*кандыдат культуралогіі, дацэнт, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі НАН Беларусі, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

## ЗАХАВАННЕ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ КАШТОЎНАСЦЕЙ І ЭСТЭТЫКІ АБРАДУ «ВАДЖЭННЕ І ПАХАВАННЕ СТРАЛЫ» ВЕТКАЎСКАГА РАЁНА: БЕЛАРУСКІ ДОСВЕД 2000–2022 гг.

**Анатацыя.** *Веснавыя карагоды «Ваджэнне і пахаванне стралы» Веткаўскага раёна, прымеркаваныя да месяцавага календара, напрыканцы XX ст. фіксаваліся ў пяці вёсках Гомельскай вобласці, а ў варыянце вёскі Казацкія Балсуны ў 2005 г. былі ўключаны ў нацыянальны спіс культурнай спадчыны Беларусі. Праз амаль 20 год абрад у жывым бытаванні захаваўся толькі ў вёсцы Стаўбун дзякуючы сістэмнай працы па падтрымцы субкультуры носьбітаў традыцыі з боку мясцовых і мінскіх спецыялістаў, экспертаў і пераемнікаў, якая, нягледзячы на шэраг поспехаў, вымагае дасканалення і пераасэнсавання.*

**Ключавыя словы:** *Беларусь, Падняпроўе, карагоды месяцавага цыкла, «Ваджэнне і пахаванне стралы», досвед аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны.*

**V. Kalatsey,**
*PhD in Cultural Studies, Associate Professor, Senior researcher at the Institute of Philosophy of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Republic of Belarus*

## PRESERVATION AND PROMOTION OF THE VALUES AND AESTHETICS OF THE «DRIVING AND BURYING OF THE ARROW» RITE OF THE VETKAV DISTRICT: THE BELARUSIAN EXPERIENCE 2000–2022

**Abstract.** *At the end of the 20th century, the ritual of the spring round dances of the lunar calendar «Driving and Burying of the Arrow» was recorded in five villages of the Gomel region. This ritual (in the version of the village of Cossack Balsuny) was included in the national list of cultural*

*heritage of Belarus. After 20 years, the rite was preserved only in the village of Staubun thanks to the systematic work of local and Minsk specialists, experts and successors to support the subculture of the bearers of the tradition. This work, despite a number of successes, today requires improvement and rethinking.*

**Key words:** *Belarus, Podneprovye, round dances of the lunar cycle, driving and burying of the arrow, experience in the protection of intangible cultural heritage.*

Абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы» Веткаўскага раёна напрыканцы XX ст. фіксаваўся ў пяці вёсках Гомельскай вобласці Беларусі: Казацкія Балсуны, Неглюбка, Стаўбун, Пералёўка, Янова, і на той час штогод агулам збіраў да 500 удзельнікаў [2]. Спевам гэтага абраду, прымеркаванага да месяцавага календара (таму яго дата штогод розніцца), былі прысвечаны вінілавыя дыскі-гіганты фірмы грамзапісу СССР «Мелодия»: «Календарные песни Белорусского Полесья» (мал. 1) і «Традиционные песни Полесья» (запісы 1982–1984 гг.) са збораў фанаграмархіва Пушкінскага дома (Інстытута рускай літаратуры Расійскай акадэміі навук), аднаго з найбольш паважаных навуковых архіваў Санкт-Пецярбурга (захавальнікам фанаграмархіва і ўкладальнікам «стрэльных» дыскаў з'яўляецца беларус Юрый Марчанка), а таксама фільм «Ушэсце ў Веткаўскім раёне» з цыкла «Радавод» (здымкі 1997 г., эфір у 1998 г.) аўдыявізуальнага антраполага Рэгіны Гамзовіч (якая супрацоўнічала з тагачаснай Белтэлерадыёкампаніяй). Кампазітар Радзівон Шчадрын, муж геніяльнай балерыны Маі Плісецкай (чый бацька Міхаіл Плісецкі нарадзіўся ў Гомелі ў 1901 г.), паводле сведчанняў мясцовых тубыльцаў, плакаў, слухаўшы «стрэльныя» спевы гурта вёскі Неглюбка ў 1980-х гг. Не дзіўна, што ў 2006 г. абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы» вёскі Казацкія Балсуны (найбольш масавы і прадстаўнічы на той час) быў пад нумарам «2» уключаны ў спіс нематэрыяльных культурных каштоўнасцей Беларусі [1]. Напачатку XXI ст. абрад ва ўсіх пяці вёсках праводзіўся штогод, на яго прыязджалі прафесійныя фалькларысты-палявікі і тэарэтыкі мастацтвазнаўства, удзельнікі фальклорнага руху, навучэнцы ўстаноў культуры і адукацыі з Беларусі, Расіі і Украіны, прывабленыя каштоўнасцямі і эстэтычнай вартасцю абраду (мал. 2).

Эстэтыка – навука, якая даследуе сутнасць і праявы прыгожага ў розных сферах жыцця, а таксама пачуццёвае ўспрыманне чалавекам рэчаіснасці, якое спрыяе спазнанню свету згодна з законамі прыгажосці і гармоніі. Як вядома, у эстэтыцы падрабязна разглядаецца праблема суадносін сапраўднасці і эстэтычнай каштоўнасці ў мастацтве. Паняцце сапраўднасці ў дачыненні да мастацтва ўжываецца ў трох значэннях: аўтэнтычнасці, унікальнасці і крэатыўнасці (творчай здольнасці) [8].




*Мал. 1.* Вінілавы дыск «Календарные песни Белорусского Полесья», 1983



*Мал. 2.* Карагод «Ваджэння і пахавання стралы» ў полі, в. Стаўбун, 2017. Фота А. Мікуса

З падачы беларускага этнамузыколага і антраполага, доктара мастацтвазнаўства Зінаіды Мажэйкі (1933–2014) выраз «аўтэнтычны фальклор» трывала ўвайшоў у айчынную гуманітарную навуку [3, с. 11]. Асобы, якія працуюць у галіне фіксацыі і перадачы моладзі народнага мастацтва Беларусі, заўсёды арыентаваліся на каштоўнасці і эстэтыку праяў айчыннага фальклору, што існуюць у «жывым» бытаванні, перадаюцца вусным шляхам «ад майстра да навучэнца» (а таму з’яўляюцца аўтэнтычнымі), паколькі ўплыў ад такіх праяў асабліва моцны і плённы для творчасці. Уражанні ад сапраўднага мастацтва спрыяюць духоўна-творчаму станаўленню асобы – працэсу набыцця духоўна-творчых якасцей, якія ахопліваюць кагнітыўную, экзістэнцыйна-эмацыйную і паводзінную сферу асобы, а таксама наступнае разгортванне на іх аснове адпаведнага крэатыўнага патэнцыялу чалавека.

Мы ўпершыню наведалі абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы» (у вёсках Казацкія Балсуны і Янова) у 2001 г. са студэнтамі-харавікамі ўніверсітэта культуры і мастацтваў. У той час у Казацкіх Балсунах у абрадзе ўдзельнічала некалькі дзясяткаў спявачак, свята назірала прадстаўнічая дэлегацыя даследчыкаў-фалькларыстаў. Абрадавая дзея выглядала вельмі ўрачыста і рабіла моцнае ўражанне на творчую моладзь, якой было наканавана займацца народнымі спевамі (пазней студэнты-гледачы абраду паспяхова рэалізоўвалі сябе ў Нацыянальным акадэмічным народным хоры Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча, фальклорным гурце «Неруш» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, педагагічнай працы ў айчынных установах вышэйшай адукацыі). Своеасаблівы «камерны» (але не менш моцны па эстэтычным уражанні) варыянт абрадавай традыцыі «Стралы» чакаў нас у вёсцы Янова. Мясцовы гурт носьбітаў традыцыі на той час складаўся ўжо толькі з шасці спявачак, і наш аўдыязапіс іх мастацтва быў адным з апошніх у гісторыі вёскі, хаця іх галасы дагэтуль гучаць на дысках

фірмы «Мелодия» як эталон гетэрафоніі Беларускага Падняпроўя. Гетэрафоніяй (ад грэч. ἕτερος – іншы і φωνή – гук) у тэорыі музыкі называюць асобы склад шматгалосся. Сутнасць гэтага старажытнага тыпу галасавядзення зводзіцца да таго, што пры выкананні адной і той жа мелодыі некалькімі галасамі ці інструментамі ў адным ці некалькіх галасах час ад часу ўзнікае адгалінаванне ад асноўнай мелодыі, якое дае ў музычнай фактуры шэраг яркіх «секундавых» напружана-прыгожых гарманічных спалучэнняў. У акадэмічнай музыцы XX ст. падобная музычная фактура характэрна перадусім эстэтыцы кампазітараў-імпрэсіяністаў – творам Клода Дэбюсі (1862–1918), Эрыка Саці (1866–1925), Ігара Стравінскага (1882–1971) і вельмі высока цэніцца музыказнаўцамі і меламанамі. У вёсцы Янова на «Страле» 2001 г. сваім гетэрафанічным мастацтвам вуснай традыцыі з творчай моладдзю падзяліліся Хадора Цішкова (1920 г. нараджэння, завадатарка гурта), яе родная сястра Ганна Селюкова (1923), Еўдакея Цімашэнка (1931), Лукер'я Ісачанка (1920), Еўдакея Таўсцянкова (1929) і Агаф'я Салаўёва (1928). Нягледзячы на ўзрост, яны былі ў неверагодна выдатнай творчай форме, а іх мастацтва вельмі ўражвала і адчыняла новыя далягляды ў падыходзе да вакалізацыі, да самой прыроды спеваў для слухаючай іх моладзі, атрымаўшай стандартную прафесійную музычную адукацыю, заснаваную на пісьмовай традыцыі.

У 2003–2020 гг. абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы» ў розных вёсках штогод наведвалі і ўзмацнялі яго правядзенне (сваімі спевамі, харэаграфіяй, веткаўскімі народнымі строямі і інструментальнай музыкай) педагогі і студэнты спецыялізацыі «этнафоназнаўства» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Дадзеная спецыялізацыя была запачаткавана на новай кафедры (этналогіі і фальклору) новага факультэта (традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва), стварэннем якіх універсітэт рэагаваў на ўстойлівую цікаўнасць да нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва, характэрную для пачатку XXI ст. Менавіта пасля нарматыўнага акта ЮНЕСКА 2003 г. «Convention for the Safeguarding of the Intangible Cultural Heritage» – Міжнароднай канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны – у БДУКМ былі створаны новы факультэт і кафедра, зарыентаваныя на культурную спадчыну краіны. Да дадзенай Канвенцыі далучылася большасць краін свету, Беларусь (у шэрагу першых дзесяці краін) – у 2004 г., хоць уласны закон аб нематэрыяльнай культурнай спадчыне (які, напрыклад, прыняты ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы ў 2011 г.) наша краіна пакуль не прыняла.

Перыядычна наведваючы падчас «Стралы» Казацкія Балсуны, Неглюбку, Стаўбун, Пералёўку, Янова цягам 20 год, немагчыма не звярнуць увагу на шэраг праблем, якія сучаснасць ставіць перад нематэрыяльнай культурнай спадчынай чалавецтва. Культура заўжды існуе выключна ў асяродку сваіх носьбітаў: кожная яе праява (стыль

выканання музыкі, манера апранацца, святы і штодзённае жыццезабеспячэнне, аздабленне жыццёвых памяшканняў і г. д.) жыве, пакуль існуе субкультура людзей, якія яе прымаюць і транслююць у сваіх паводзінах і свядомасці, прычым маюць магчымасць (светасузіральную і матэрыяльную) для дадзенай трансляцыі.

Светасузіральная аснова «Ваджэння і пахавання стралы» досыць архаічная (што зусім не значыць «неактуальная» ці «састарэлая»). Яна, хоць і прымеркавана да Ушэсця (гэта 40-ы дзень пасля Вялікадня, дзень, паводле хрысціянскай традыцыі, цялеснага ўзнясення Ісуса Хрыста на нябёсы), аднак мае відавочна дахрысціянскае паходжанне – у сатэрыялагічных (выратаванне) практыках, кульце продкаў і ўрадлівасці першых мясцовых аседлых земляробаў [4]. Таму мясцовыя праваслаўныя святары звычайна ці не вітаюць, ці катэгарычна забараняюць сваім вернікам удзел у свяце. Нават стараверы, якія з XVII ст. (пасля жорсткіх рэлігійных праследаў у Расіі) аселі на Веткаўшчыне, як правіла, не выходзілі на шэсці і карагоды «Стралы» (гіпотэза пра тое, што «Страла» – спадчына старавераў з'явілася на мяжы XX–XXI стст. у асяродках расійскага моладзевага фальклорнага руху, а таксама ў іх спадкаемцаў у галінах прафесійнай фалькларыстыкі і шэрагу рускіх дыяспар краін Балтыі).

У XXI ст. перакананне ў тым, што «Стралу» трэба абавязкова вадзіць, не абавязкова павінна быць абумоўлена клопатам пра душы сваякоў і продкаў (разам з тым такі клопат – сведчанне шанавання сваяцкіх і сацыяльных сувязяў у сваёй супольнасці, сваім народзе), яно можа быць выклікана прагай творчай самарэалізацыі і сцвярджэння сваёй ідэнтычнасці з боку асобы, народжанай і пасталеўшай на Беларускім Падняпроўі. Досвед постфальклорнага гурта «Ягорава гара» (салістка – выпускніца спецыялізацыі «этнафоназнаўства», удзельніца імпрэз «Стралы» 2005–2010 гг. Ірына Глушэц), які папулярызуе песні «Стралы» на масавых святах, а таксама гомельскага філіяла Веткаўскага музея старaабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф. Р. Шклярава (загадчык – удзельнік «стрэльных» абрадаў 2006–2010 гг. Пятро Цалка), які актыўна аднаўляе традыцыі веткаўскага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, інтэрактыўна далучае моладзь Гомеля да традыцыйнай культуры рэгіёна – сцвярджэнне прагі захавання светасузіральнай асновы і эстэтыкі «Ваджэння і пахавання стралы» з боку маладога пакалення жыхароў Гомельшчыны XXI ст.

Матэрыяльная аснова існавання паводзіннай часткі кожнай культуры звязана з дабрабытам людзей-носьбітаў дадзенай культуры. Сёння, калі 75% насельніцтва Беларусі з'яўляюцца жыхарамі гарадоў, надышоў час задацца пытаннем інвестыцый у захаванне субкультуры яе вясковых супольнасцей – носьбітаў каранёвай культуры краіны. У гэтым няма нічога штучнага: у такім напрамку рухаецца большасць краін свету, а таксама іх улады. Кнэсет (вышэйшы заканадаўчы орган) Ізраіля штогод

выдаткуе на захаванне традыцыйнай культуры свайго народа $ 3,5 мільярда. Швейцарыя так моцна папулярызуе сярод насельніцтва і інвестыцыйна падтрымлівае сваю сельскую гаспадарку, што 60 % харчовых тавараў для насельніцтва краіны вырабляецца яе ўласнай аграрнай галіной, хаця доля аграрыяў у нацыянальным ВВП Швейцарыі – толькі 1 % [7]. У XXI ст. прадуманыя інвестыцыі ў асяродкі каранёвай (вясковай у выпадку Беларусі) культуры здольны захаваць лад жыцця і мастацтва вуснай традыцыі ўсіх рэгіёнаў краіны.

Жыхары Веткаўшчыны заўсёды ведалі высокую эстэтычную каштоўнасць сваёй культуры і мастацтва і (пры падтрымцы факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва БДУКМ, які знаходзіў неабходныя інвестыцыі) у 2006–2018 гг. з годнасцю прэзентавалі сваю «стрэльную» традыцыю ў Мінску, Санкт-Пецярбурзе і Вільнюсе (мал. 3). Паколькі фармат такой прэзентацыі (міжнародны фестывальны рух) патрабуе пэўнай ступені фармалізацыі творчай актыўнасці людзей, супрацоўніцтва з носьбітамі «Стралы» было засяроджана на гурце, існуючым пры дзяржаўнай установе – гурце «Стаўбунскія вячоркі» Стаўбунскага сельскага дома культуры (лідар – Святлана Парашчанка). Уцягнутасць у фестывальны рух, знаёмства з яго маладымі актывістамі і фундатарамі ўвесь гэты час (ад 2005 г. да 2018 г., калі «Стаўбунскія вячоркі» ўдзельнічалі ў прэзентацыі манаграфіі «Цень Стралы: культурныя і вербальныя коды традыцыі» [6] у Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь [5]) мацавала і яднала носьбітаў традыцыі са Стаўбуна (мал. 4). У выніку на сёння гурт з Дома культуры дадзенай вёскі – адзіны асяродак на Веткаўшчыне, які перманентна падтрымлівае традыцыю «Ваджэння і пахавання стралы» ў рэгіёне, штогод стабільна выводзіць людзей на шэсце і карагоды свята, захоўвае спеўны рэпертуар, далучае да яго мясцовую моладзь.




*Мал. 3.* Гурт «Стаўбунскія вячоркі» на фэсце «Pakrouskija zvany». Вільнюс, 2012




*Мал. 4.* Манаграфія, прысвечаная абраду «Стралы», 2018

Нягледзячы на статус нематэрыяльнай культурнай каштоўнасці абраду, без уключэння ў сацыяльна-культурную актыўнасць з удзелам маладых пераемнікаў традыцыі да 2022 г. «Ваджэнне і пахаванне стралы» ў вёсцы Казацкія Балсуны фактычна перайшоў у латэнтны (існуючы выключна ў памяці і свядомасці носьбітаў) стан. Тое ж самае збольшага адбылося з абрадавымі традыцыямі вёсак Неглюбка, Пералёўка, Янова. На святкаванне Ушэсця 2022 г. іх жыхары не выходзілі, на іх вуліцах не гучалі гетэрафанічныя песні і не заводзіліся карагоды. Прыклад вёскі Стаўбун (дзе ўсё гэта было і будзе існаваць далей) сведчыць, што пільная ўвага да нематэрыяльнай культурнай спадчыны, праектная дзейнасць па захаванні яе паводзінных праяў ва ўмовах актуальнага часу, спробы ўмацаваць субкультуру носьбітаў традыцыі (асабліва, калі дадзеныя захады падтрыманы інвестыцыйна) у Беларусі сёння яшчэ здольны даць плён, але патрабуюць асэнсаванага і сістэмнага падыходу.

Дадзены факт вымушае звярнуць увагу на сістэму фінансавання ўстаноў сферы культуры і інвестыцый у развіццё аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі, тым больш, што пасля рэарганізацыі кафедры этналогіі і фальклору і факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ў БДУКМ (2021), абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы» (як і шэраг іншых абрадаў розных рэгіёнаў краіны) не падтрымліваецца маладымі спевакамі і музыкамі Беларусі; кола яго ўдзельнікаў абмяжоўваецца гуртом вёскі Стаўбун; у заяўленай у спісе нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі вёсцы Казацкія Балсуны ён не праводзіцца, таму само яго існаванне сёння знаходзіцца пад відавочнай пагрозай знікнення.

Сітуацыя, калі, пасля відавочных поспехаў у галіне аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны, краіна можа страціць цэлыя «пласты» сваёй каранёвай культуры, досыць небяспечная, але пра праблемы, якія ставіць перад намі час, варта сур'ёзна разважаць і імкнуцца іх вырашыць, паколькі «самі па сабе» такога кшталту праблемы не вырашаюцца. Захаванне і папулярызацыя каштоўнасцей і эстэтыкі абраду «Ваджэнне і пахаванне стралы» – досыць актуальная задача, якую трэба і варта вырашаць на карысць народа Беларусі і міжнароднай супольнасці, якія сумесна ўзялі на сябе абавязак аховы і трансляцыі ў часе нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва – абавязак, зафіксаваны ў Канвенцыі ЮНЕСКА 2003 г.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

*1.* Абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы» // Livingheritage.by : сайт. – Рэжым доступу: https://livingheritage.by/nks/2040/. – Дата доступу: 14.09.2022.

2. *Гамзовіч, Р.* «Страла», «Сула», «Стрылка» як нематэрыяльная культурная каштоўнасць / Р. Гамзовіч // Цень Стралы : культурныя і вербальныя коды традыцыі / пад рэд. Рымы Кавалёвай і Вячаслава Калацэя. – Мінск, 2018. – С. 18–37.

3. *Дарашэвіч, Э.* Тэорыя фальклору : вучэб.-метад. дапам. / Э. Дарашэвіч ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск: БДУКМ, 2016. – 78 с. : іл.

4. *Калацэй, В.* Страла і стадыяльна-сатэрыялагічная структура абраднасці рухомых свят Пасожжа / В. Калацэй // Цень Стралы : культурныя і вербальныя коды традыцыі / пад рэд. Рымы Кавалёвай і Вячаслава Калацэя. – Мінск, 2018. – С. 127–134.

5. Прэзентацыя калектыўнай манаграфіі «Цень Стралы : культурныя і вербальныя коды традыцыі» // Histmuseum.by : сайт. – Рэжым доступу: http://histmuseum.by/by/news/1718/. – Дата доступу: 14.09.2022.

6. Цень Стралы : культурныя і вербальныя коды традыцыі / пад рэд. Рымы Кавалёвай і Вячаслава Калацэя. – Мінск : ІВЦ Мінфіна, 2018. – 198 с. : іл.

7. Экономика Швейцарии // Switzerland-tour.com : сайт. – Режим доступа: https://switzerland-tour.com/ru/information/economy. – Дата доступа: 14.09.2022.

8. Эстетическая ценность // Bstudy.net : сайт. – Режим доступа: https://bstudy.net/724421/iskusstvo/esteticheskaya_tsennost. – Дата доступа: 14.09.2022.

УДК 341.241.7:008:069.6(476.2)

**А. Д. Кирбай,**

*магистр исторических наук, старший инспектор сектора информационно-аналитической работы управления идеологической работы, культуры и по делам молодежи Гомельского городского исполнительного комитета, г. Гомель, Республика Беларусь*

## СОВРЕМЕННОЕ СОСТОЯНИЕ И ПЕРСПЕКТИВЫ ОХРАНЫ НЕМАТЕРИАЛЬНОГО КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ НА ПРИМЕРЕ ВЕТКОВСКОГО РАЙОНА

**Аннотация.** *Рассмотрены приоритетные направления охраны нематериального историко-культурного наследия Беларуси на современном этапе. На примере Ветковского района анализируется ограничительный характер влияния аварии на Чернобыльской атомной электростанции (определенная изолированность региона) на сохранение народных традиций. Показаны наиболее перспективные векторы развития историко-культурного потенциала Ветковского района, основные*